# МІНЫ НЕ УЗАРВАЛІСЯ

Маршал інжынерных войск В. К. Харчанка ў сваёй кнізе ўспамінаў «...Специального назначения» праўдзіва і ярка расказвае аб воі-нах-мінёрах 1-й гвардзейскай інжынернай брыгады спецыяльнага прызначэння.

Вялікую работу правялі мінёры па вырата-ванню многіх будынкаў Гомеля і Навабеліцы. Адступаючы пад ударамі Савецкай Арміі, гіт-лераўцы сталі ўсё часцей выкарыстоўваць мінна-ўзрыўныя загароджы. Складаныя і не-бяспечныя заданы па абясшкоджванню мін замаруджанага дзеяння былі ўскладзены на 8-ы гвардзейскі батальён спецыяльнага мініравання, якім камандаваў падпалкоўнік Ю. М. Пергамент. Савецкія сапёры выратавалі ў Гомелі ад разбурэння шмат вялікіх будынкаў і прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку электрастанцыю, клуб воднікаў, інтэрнат чыгуначнікаў, гарадскі тэатр, Дом Камуны, Дом спецыялістаў, школу № 27, будынак педагагічнага інстытута, запалкавую фабрыку. Вось што піша пра гэтыя падзеі 6. К. Харчанка: «У Гомель сапёры-разведчыкі 8-га гвардзей-скага батальёна спецыяльнага мініравання ўвайшлі на досвітку 26 лістапада 1943 года разам з перадавымі часцямі 11 -й арміі. Го-рад уяўляў сабой сумнае відовішча. На па-жарышчах сіратліва тырчэлі задымленыя пяч-ныя каміны. Ад многіх цагляных будынкаў за-сталіся толькі груды развалін.

Яшчэ пры размініраванні Навабеліцы нам удалося даведацца, хто тут устанаўліваў МЗД. Аб гэтым расказалі мясцовыя жыхары і ваен-напалонныя. Гэта зрабіла спецыяльная гітлераўская сапёрная трупа «Зондзркаманда-29». Ездзілі яны на цяжкім грузавіку з кузавам, прыкрытым камуфліраваным брызентам. Калі ўвайшлі ў горад, разведчыкі капітана Баякова распытвалі жыхароў, ці не сустракалі яны такую машыну. Высветлілася, што за 2—3 дні да едходу гітлераўцаў яе бачылі ля бу-дынка дзяржаўнага банка, тэатра імя М. І. Калініна і ля школы № 27. У першую чаргу вырашылі праверыць менавіта гэтыя аб'екты. Амаль адначасова прыступілі да пошуку мін і ў іншых буйных будынках...

Размініраванне Навабеліцы і Гомеля было добрай школай для мінёраў брыгады. Аднак мы разумелі, што ад адступаючых гітлераў-цаў можна чакаць любога каварства. Ведалі, што наперадзе яшчэ шмат будзе розных уз-рыўных пастак і сюрпрызаў...».

Калі праходзіш сёння па цудоўных вуліцах нашага горада і глядзіш на будынкі, якія некалі хацелі ўзарваць фашысцкія вылюдкі, зноў і зноў думаеш з удзячнасцю аб лю-дзях, што рызыкавалі жыццём, але выратавалі гэтыя будынкі.